№.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

*З жыцьця беларускіх суполак*

**Ірына Хадарэнка: Беларусы ў Н’ю-Ёрку разам з Украінай!!!**

У нядзелю, 27-га лютага, пры падтрымцы Беларускай асветніцкай Лігі Амерыкі, у цэнтры Нью-Йорка прайшлі маштабныя акцыі пратэсту супраць расійскай агрэсіі. Прадстаўнікі самых розных нацыянальнасцяў сабраліся ў Манхэтэне ля Расійскага Консульства, каб выказаць сваё абурэнне развязваннем вайны ва Украіне і акупацыяй Беларусі.

Ад Консульства ўдзельнікі маніфестацыі прайшлі маршам да будынку ААН. У калоне маршыруючых, акрамя амерыканцаў, былі ўкраінцы, беларусы, грузіны, казахі, літоўцы, латышы, палякі, азербайджанцы і нават расіяне. Акцыя суправаджалася выкананнем гімна Ўкраіны, песень беларускіх гуртоў і агучваннем папулярных лозунгаў.

Характэрна, што ў адказ на запыт спецыяльнага дазволу на правядзенне гэтага мерапрыемства ў мясцовым паліцэйскім участку арганізатарам адказалі: “Не варта турбавацца, гэта ваша законнае права выказаць сваё меркаванне”. У той час як, напрыклад, у Беларусі, у той жа самы дзень за ўдзел у антываенных пратэстах былі арыштаваныя звыш 500 чалавек.

..............................................................................................................................

В воскресенье, 27-го февраля, при поддержке Белорусской просветительской Лиги Америки, в центре Нью-Йорка прошли масштабные акции протеста против российской агрессии. Представители самых разных национальностей собрались в Манхэттене у Российского Консульства, чтобы выразить свое негодование развязыванием войны в Украине и оккупацией Беларуси.

От Консульства участники манифестации прошли маршем до здания ООН. В колонне марширующих, помимо американцев, были украинцы, белорусы, грузины, казахи, литовцы, латыши, поляки, азербайджанцы и даже россияне. Акция сопровождалась исполнением гимна Украины, песен белорусских музыкальных групп и скандированием популярных лозунгов.

No.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

Примечательно, что в ответ на запрос специального разрешения на проведение данного мероприятия в местном полицейском участке организаторам ответили: “Не стоит беспокоиться, это ваше законное право высказать своё мнение”. В то время как, например, в Беларуси, в тот же самый день за участие в антивоенном протесте были арестованы свыше 500 человек.





ISSN 2562-950






№29, красавік 2022 ISSN 2562-950






 ISSN 2562-950

**Беларусы Атавы разам з Украінай супраць расійскай агрэсіі**

Беларусы Атавы прынялі ўдзел у двух дэманстрацыях супраць пуцінаўскай вайны, злачынна-развязанай ім ва Украіне:

6 лютага 2022 года прайшоў пікет ля расійскай амбасады, дзе прымалі удзел больш за 200 чалавек. У пікеце прынялі ўдзел сябры Атаўскага аддзела Згуртаваньня беларусаў Канады і прадстаўнікі іншых дыяспар, прыйшоўшых па просьбе арганізатараў з адпаведнымі банэрамі. Падчас мітынгу былі выкананы гімны Канады і Украіны, гучалі прамовы, песні; беларусаў віталі шматлікімі воклічамі "Жыве Беларусь!"

27 лютага 2022 года адбылася дэманстрацыя ад расійскай амбасады да гарадской мэрыі, дзе прымалі ўдзел больш за 2.000 чалавек. На мітынгу каля амбасады выступалі сябры парламента Канады, уключна з лідэрам апазіцыі, прадстаўнікі украінскіх арганізацый і дыяспар. На мітынгу і ў шэсьці да гарадской мэрыі прынялі ўдзел больш за 30 беларусаў Атавы.

Беларусы не маюць ніякага дачыненьня да саўдзельніка і злачынцы Лукашэнкі, які непасрэдна далучыўся на дарогу вайны сёньня, што сталася вынікам даўно заключанага ім саюза з Расіяй.

Беларусы разам з Украінай! “Стоп вайне!”

“Ганьба пуцінскаму рэжыму”.

“Ганьба лукашэнкаўскаму рэжыму”.



*6 лютага 2022 года. Пікет каля расійскай амбасады. Здымак Алеся Каралькевіча*




*6 лютага 2022 года. Пікет каля расійскай амбасады. Здымак Алеся Каралькевіча*



*27 лютага 2022 года. Атава. Антываенная дэманстрацыя.*
*“НЕ” вайне! “Рукі прэч ад Украіны”.*

№29, красавік 2022 ISSN 2562-950




*27 лютага 2022 года. Атава. Група беларусаў на антываеннай дэманстрацыі. "НЕ" вайне! "Рукі прэч ад Украіны".*

**Да выступу на мітынгу у падрымку Украіны. Пётра Мурзёнак**

*Парламент Хіл, 6 сакавіка 2022 года*

Паважаныя сябры!

Сёньня мы прыйшлі каб сказаць рашучае не вайне, якую Расія вераломна распачала супраць Украіны.

Застаўшыяся з савецкіх часоў выкапні, злачынцы і вар'яты забіваюць мірных жыхароў і хочуць сцёрці з зямлі украінскую дзяржаву.

Ад імя вольных беларусаў хачу выказаць безумоўную падтрымку Украіне  і тым шматлікім ваярам, якія з 2014 года бароняць Украіну. Сёньня больш за 200 беларусаў змагаюцца са зброяй у руках у Збройных сілах Украіны супраць расійскіх захопнікаў.

Беларусы па ўсяму свету разам з украінцамі пратэстуюць супраць вайны ва Украіне. Толькі у мінулую нядзелю Лукашэнкаўскім рэжымам было арыштавана ў Беларусі больш 800 пратэстоўцаў.

Беларускія партызаны ладзяць дыверсіі на беларускай чыгунцы, каб перашкодзіць перавозцы расійскіх войскаў.

Беларусы разам з украінцамі і вераць у перамогу.

Ганьба Лукашэнкаўскаму дыктатарскаму рэжыму!

Ганьба Пуцінскаму фашыскаму рэжыму!

Слава Украіне!

Жыве Беларусь!

6 сакавіка 2022 года

**Ірына Хадарэнка: Дзень Волі адзначылі ў Нью-Ёрку**

25 сакавіка 2022 года прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Нью-Ёрку пры падтрымцы Беларускай Асветніцкай Лігі Амерыкі зладзілі акцыю, прысвечаную Дню Волі.

Найперш удзельнікі мерапрыемства сабраліся каля Консульства Расіі, дзе выказалі сваё абурэнне агрэсіўнымі дзеяннямі Расійскай Федэрацыі ў дачыненні да суседніх дзяржаваў, асабліва да Ўкраіны, і дэкларавалі патрабаванне скасавання існуючага фармальнага хаўрусу Беларусі з дзяржавай-агрэсарам. Пасля пратэстоўцы рушылі праз увесь Манхэтан, уздоўж Цэнтральнага парку, да будынка Аб’яднаных Нацый, насуперак якога адбылася другая частка мітынгу.

Варта адзначыць прыязнае стаўленне да імпрэзы з боку мясцовай паліцыі. Афіцэры не толькі прадэманстравалі надзвычайную ветлівасць, але і давалі карысныя парады наконт маршруту, каб зрабіць акцыю заўважнай для большай колькасці людзей. Таксама на працягу ўсяго марша, калону суправаджаў паліцыйскі картэж, прадстаўляючы дэманстрантам магчымаць рушыць нават на чырвонае святло і забяспечваючы бяспечнае правядзенне ралі.

Фіналам мерапрыемства стала вывешванне гістарычнага беларускага сцяга ў Цэнтральным вакзале мегаполіса.

*Фотаздымкі Юрыя Эбера і Міхася Чаропкі*

ISSN 2562-950









5 Av
Museum Mile
POLICE


STOP WAR

No.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

**Ірына Хадарэнка: Да дня раз'яднання з Расіяй у Нью-Ерку**

2 красавіка 2022 года беларускія актывісткі ў Нью-Ёрку арганізавалі мітынг каля Расійскага Консульства, які быў прымеркаваны да штучна створанага Дня паяднання народаў Расіі і Беларусі.

Паводле арганізатараў, так званае "паяднанне" з'яўляецца насамрэч паглынаннем і паслядоўнай анэксіяй Беларусі з боку Расійскай Федэрацыі, якая ў апошні час яшчэ і выкарыстоўвае беларускую тэрыторыю для нападаў на Ўкраіну.

Удзельніцы акцыі выступілі за неабходнасць скасавання хаўрусу з Расіяй і выказалі ўсебаковую падтрымку ўкраінскаму народу ў барацьбе з акупантамі.

Таксама беларускі жаночы батальён здзейсніў выключна мірную "спецаперацыю" па сімвалічнай бамбардзіроўцы будынка Расійскага Консульства папяровымі самалёцікамі з не надта прыязнымі пажаданнямі расійскаму ўраду.

Мерапрыемства адбылося пры падтрымцы мясцовай паліцыі, а таксама пры садзейнічанні Беларускай Асветніцкай Лігі Амерыкі.

*Фотаздымкі Дзяніса Саклакова*



№29, красавік 2022 ISSN 2562-950






No.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

**Беларусы ўшанавалі памяць Тадэвуша Касцюшкі ў ЗША**

*Тэкст і фота*: Міхася Чаропкі і Ірыны Хадарэнка

Прадстаўнікі беларускай дыяспары ў ЗША прынялі ўдзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным памяці нашага славутага земляка Тадэвуша Касцюшкі, якое штогадова адбываецца ў Ваеннай Акадэміі ў Вэст-Пойнце (штат Нью-Ёрк). Менавіта ў гэтую мясцовасць вясной 1778 года, падчас змагання Злучаных Штатаў за незалежнасць ад Вялікабрытаніі, прыбыў легендарны генерал і вайсковы інжынер, каб заняцца ўдасканаленнем фартыфікацыйных збудаванняў над ракой Гудзон. Зараз жа ў гэтым маляўнічым кутку Нью-Ёркшчыны дзейнічае адна з набольш прэстыжных навучальных установаў у галіне вайсковай справы.

На імпрэзе прысутнічалі супрацоўнікі дыпламатычнага корпуса Літвы і Польшчы, ветэраны, вайскоўцы розных рангаў, кадэты, сябры грамадскіх арганізацый. "Разынкай" мерапрыемства стаў парад, які зладзілі навучэнцы ваеннай акадэміі ў суправаджэнні вайсковага аркестру. Бадай, найбольш уразіў гасцей выступ маладых парашутыстаў, якія дэманстравалі сапраўднае майстэрства з дакладным прызямленнем у дакладную лакацыю на стадыёне.  Дарэчы, у Акадэміі праходзяць навучанне не толькі хлопцы, але і дзяўчаты, служба якіх не прадугледжвае ніякіх асаблівых саступак.

Нягледзячы на тое, што мерапрыемства праводзілася ўжо ў 19-ы раз, беларускія актывісты (сярод якіх былі прадстаўнікі Беларуска-Амерыканскага Задзіночання BAZA і Беларуска-Асветніцкай Лігі Амерыкі (BELA)) афіцыйна прысутнічалі на ім ўпершыню, аднак ужо атрымалі запрашэнне на наступны год. Больш за тое, адзін з нашых землякоў выступіў перад аўдыторыяй са змястоўным дакладам, а таксама ўсталяваў у канферэнцыйнай залі бел-чырвона-белы сцяг.

Вялікую цікавасць выклікаў выступ 93-гадовага прафесара Збігнева Крушэўскага – жывога сведкі Варшаўскага паўстання, а ў пазнейшым – вайскоўца і навукоўца. Прафесар шчыра распавёў пра шэраг эпізодаў адных з найбольш трагічных і ў той жа час гераічных старонак Другой сусветнай вайны, калі ён ажно пяць разоў аказваўся на мяжы пагібелі, аднак усё ж такі здолеў уратавацца і ў выніку стаў прафесарам універсітэта ў Чыкага.

Варта адзначыць, што прысутныя на імпрэзе генеральныя консулы Польшчы і Літвы неаднаразова ўзгадвалі Беларусь і беларусаў, лёс і будучыня якіх зараз вельмі спалучаныя з лёсам Украіны. Паводле меркавання дыпламатаў, менавіта Ўсходняя Еўропа зараз – гэта той “кацёл”, дзе крышталізуецца новае моцнае і свабоднае ўсходнееўрапейскае грамадства. І ў гэтай звязцы роля кожнай асобнай краіны вельмі важная, асабліва з улікам неабходнасці супрацьстаяння расійскай агрэсіі.





№.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

**МЭМАРАНДУМ беларускай дыспары ў ЗША ў дачыненні да бягучай сітуацыі на радзіме**

Мы, прадстаўнікі беларускай дыяспары ў ЗША, прызнаючы наяўнасьць акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі й ўсьведамляючы адказнасьць за катастрафічныя наступствы расейскай ваеннай агрэсыі ва Ўкраіне, зьвяртаемся да суродзічаў, якія засталіся на радзіме.

Прымаючы да ўвагі той факт, што на сёньняшні момант Расейская Фэдэрацыя *дэ юрэ* й *дэ факта* з’яўляецца дзяржавай-тэрарыстам і нясе пагрозу ня толькі сваім бліжэйшым суседзям, але й ўсяму цывілізаванаму сьвету, мы абсалютна перакананыя ў тым, што беларускія грамадзяне не павінныя заставацца ў баку ад таго, што адбываецца, і мусяць любымі дасяжнымі сродкамі дамагацца наступнага:

- тэрміновага й неадкладнага вываду расейскіх войскаў з тэрыторыі Беларусі;
- скасаваньня дамовы аб калектыўнай бясьпецы (АДКБ), якая дазваляе Расеі выкарыстоўваць тэрыторыю Беларусі для ваеннай агрэсыі;
- ануляваньня незаконнай дамовы аб стварэньні так званай Саюзнай дзяржавы з Расейскай Фэдэрацыяй;
- выйсьця з Мытнага зьвязу й іншых хаўрусаў, створаных нелегітымнай уладай з мэтай паступовага паглынаньня нашай краіны ўсходнім суседам;
- увядзеньня пашпартнага кантролю на мяжы з РФ.

Беларусь павінна вярнуцца ў Эўропу, а не заставацца ў ганебных хаўрусах з дзяржавай-агрэсарам! Гэта будзе магчымым пасьля вырашэньня першачарговай задачы – ліквідацыі антыбеларускага па сваёй сутнасьці рэжыму Лукашэнкі. І за гэта неабходна штодзённа змагацца.

Жыве Беларусь!

*2 красавіка 2022 года*

Ад імя Беларускага Нацыянальнага сакратарыяту (БНС) – Зянон Пазьняк;

Ад імя Беларуска-Амэрыканскага згуртаваньня “ПАГОНЯ” – Віталь Зайка;

Ад імя Беларускай Асьветніцкай Лігі Амэрыкі (BELA) – Ірына Хадарэнка;

Ад імя Беларуска-Амэрыканскай Асацыяцыі “BAZA” – Натальля Федарэнка;

Ад імя Беларускага Інстытута Амэрыкі (BIA) – Алена Рыдзеўская;

Ад імя Беларускай Фундацыі імя Пётры Крэчэўскага – Галіна Тумаш-Павэлс.

**MEMORANDUM**

We, the representatives of the Belarusian diaspora in the USA, recognizing the existence of the occupation regime on the territory of Belarus and realizing the responsibility for the catastrophic consequences of the Russian military aggression in Ukraine, claim to the compatriots who are currently in the homeland.

Taking in the view the fact, that today de jure and de facto the Russian Federation is a terrorist state, that threatens not only its closest neighbors, but also the entire civilized world, we are absolutely convinced that Belarusian citizens should not stay away from the situation and they must achieve the following, using all available resources:

- urgent and immediate withdrawal of Russian troops from the territory of Belarus;

- the abolition of the Collective Security Treaty, which allows Russia to use the territory of Belarus for military aggression;

- annulment of the illegal agreement on the establishment of the so-called Union State with the Russian Federation;

- cancellation of the Customs Union and other allies formed by the illegitimate government and aimed to gradually absorb our native country by the eastern neighbour;

- implementation of passport control on the border with Russia.

Belarus must return to Europe and to leave all shameful alliances with the aggressor state! It will be possible after solving the priority task - the elimination of the anti-Belarusian regime of Lukashenka. It is necessary to fight for it every day.

Long live Belarus!

*April 2, 2022*

On behalf of the Belarusian National Secretariat (BNS) - Zianon Pazniak;

On behalf of the Belarusian-American Association “PAHONYA” - Vital Zaika;

On behalf of the Belarusian Enlightenment League of America (BELA) - Iryna Khadarenka;

On behalf of the Belarusian-American Association “BAZA” - Natallia Fedarenka;

On behalf of the Belarusian Institute of America (BIA) - Alena Rydzeuskaya;

On behalf of the Belarusian Kreceuski Foundation - Halina Tumash-Pavels.

**From the life of Belarusian organizations**

***(webzine Culture. Nation, issue 29, April 2022, 537-553, www.sakavik.net)***

Information is given about anti-war protest actions in support of Ukraine (New York, 02/27/2022; Ottawa, 02/06/2022, 02/27/2022, 03.06.2022), Freedom Day / Dzen Voli (New York, 03/25/2022), "Day of separation from Russia" (New York, 04/2/2022), performance in honor of T. Kascjushka (New York). Texts by Irina Khadarenka and Piotra Murzionak, including the text of his speech at the rally (Ottawa, 03/06/2022); photos - Ales Karalkevich, Denis Saklakov, Irina Khadarenka, Mikhas Charopka and Yury Eber. The same section contains the Memorandum of the Belarusian diaspora in the USA regarding the current situation in the homeland.

**Из жизни беларусских организаций**

***(веб-журнал Культура. Нация», вып. 29, апрель 2022, 537-553, www.sakavik.net )***

Даются сведения о протестных антивоенных акциях в поддержку Украины (Нью-Йорк, 27.02.2022; Оттава, 4.02 и 27.02.2022), Дне Воли (Нью-Йорк, 25.03.2022), «Дне разъединения с Россией» (Нью-Йорк, 2.04.2022), импрэзе в честь Т. Костюшки (Нью-Йорк). Тексты Ирины Хадаренка и Пётры Мурзёнка, включая текст его выступления на митинге (Оттава, 27.02.2022); фотографии - Алеся Каралькевича, Дениса Саклакова, Ирины Хадаренка, Михася Чаропки и Юрия Эбера. В этом же разделе размещён Меморандум беларусской диаспоры в ЗША в отношении текущей ситуации на родине.